**Макараў М.Д.**

# ДЗВЕ КАРТЫ ЭПОХІ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА З ФОНДАЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА ГІСТАРЫЧНАГА АРХІВА БЕЛАРУСІ

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГА Беларусі) з'яўляецца найбуйнейшым у краіне сховішчам дакументаў па гісторыі Беларусі XIV–XVIII стст. Картаграфічныя крыніцы гэтага перыяду з тэрыторыі Усходняй Еўропы з'яўляюцца вялікай рэдкасцю, і іх спецыяльныя калекцыі ў НГА Беларусі адсутнічаюць. Тым не менш, асобныя карты і планы эпохі Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ) спарадычна выяўляюцца работнікамі архіва пры праглядзе матэрыялаў розных фондаў. Размова пойдзе пра дзве такія знаходкі.

Першая з іх з'яўляецца помнікам вайсковай картаграфіі другой паловы XVI ст., які, несумненна, варта залічыць да катэгорыі ўнікальных. Гэта – **схематычная карта Інфлянтаў** (тэрыторыя сучасных Латвіі і Эстоніі), **складзеная на пачатковым этапе Інфлянцкай вайны (1558–1583 гг.)** [4, арк. 237 адв.–238].

Карта ўключана ў архіўную справу, якая ў асноўным складаецца з дакументаў, што маюць непасрэдныя адносіны да гісторыі Прапойскага і Чачэрскага старостваў (усходняя частка Беларускага Падняпроўя) [4]. Варта нагадаць, што ў другой палове XVI – пачатку XVII ст. гэтыя адміністрацыйныя адзінкі знаходзіліся ў руках прадстаўнікоў шляхецкага роду Зяновічаў (Дэшпатаў-Зяновічаў). Храналагічныя рамкі справы – 1547–1750 гг. Асаблівасці почырку дазваляюць датаваць час стварэння карты другой паловай XVI ст.

Карта намалявана на аркушы паперы, які ў наш час мае памеры 42×31 см (магчыма, пры выкананні рэстаўрацыйных работ ён быў падрэзаны з бакоў) і, пры нетыповай для сучаснай картаграфіі арыентацыі «на ўсход», мае наступны змест. У правай (паўднёвай) частцы малюнка прысутнічаюць: ***рака Дзвіна*** (*«tho yesth rzeka Dzwyna»*), рэчышча якой аўтар спачатку паказаў у выглядзе амаль прамой лініі, але пазней, каб змясціць дадатковыя аб'екты, перанёс бліжэй да правага краю аркуша; ***левы прыток Дзвіны*** (*«tha rzeka w Dzwine wpada»*), які можна з упэўненасцю атаясамляць з ракой **Ліелупэ** (латыш. – Lielupe); ***Курляндыя*** (*«tho Kurska ziemia»*), гістарычны рэгіён Латвіі; ***паўночная мяжа Інфлянтаў з ВКЛ*** (*«tho granica lithewska»*) і ***частка тэрыторыі ВКЛ*** (*«thu zamky I(eg)o K(rólewskiej) M(ości)»*); замкі і гарады ўздоўж лініі Дзвіны (размешчаныя, часам, на значнам аддаленні ад яе) – ***Дынамюндэ*** (*«Dynmon zamek oth Rygy dwie mili»*, латыш. – Daugavgrīva), ***Рыга*** (*«Ryga»*), ***Добель*** (*«Doblien»*, латыш. – Dobele), ***Больск*** (*«Bolsk»*, латыш. – Bauska), ***Зельбург*** (*«Zelbork»*, латыш. – Vecsēlpils), ***Неўгін*** (*«Nyewhin»*, латыш. – Daugavpils), ***Рэжыца*** (*«Reziten»*, латыш. – Rēzekne), ***Люцын*** (*«Livcen»*, латыш. – Ludza), ***Марыенгаўзен*** (*«Marinhawzen»*, латыш. – Viļaka).




***Мал. 1. Карта Інфлянтаў (канец 1559 – першая палова 1560 г.)***

Левая (паўночная) і цэнтральная часткі малюнка падзелены гарызантальнай лініяй, што цягнецца ад яго краю (Фінскі заліў) у раён паміж замкамі Адзель і Неўгін. Ёй абазначана ***мяжа прасоўвання войскаў Маскоўскай дзяржавы*** (*«po thyth thy wszystky zamky wyssey pysane moskwa pobrala»*) у Інфлянтах на момант стварэння малюнка.

Ніжэй за лінію (на захад ад яе), акрамя Дынамюндэ і Рыгі, пазначаны толькі два значныя эстонскія гарады: ***Талін*** (*«thu Rewel, zamek y miasto niemieckie»*) і ***Пярну*** (*«thu Pernuw, zamek niemiecky y miasto, co liezi nad slonym morem»*). Вышэй за лінію (на ўсход ад яе, у сектары, падкантрольным Маскве) на карце прадстаўлены наступныя аб'екты: ***усходняя мяжа Інфлянтаў з Маскоўскай дзяржавай*** (*«tho yesth granica moskiewska»*); ***Чудскае возера*** (*«tho yesth iezioro, ktore przi granici moskiewskiey lyezi, przezywayą go Theypyss, ktore(g)o yeziora [1]2 mil wdluz, a iz thesz mil poprzek, w tho yezioro byl wstąp niemcom y moskwie»*); ***дзве ракі***, адна з якіх выцякае з Чудскага возера (*«A tho rzeka s te(g)o ieziora wychodzi»*, яе можна ўпэўнена атаясамляць з **ракой Нарвай**), а другая – упадае ў яго (*«tho rzeka w tho yezioro ydzie»*, яе ідэнтыфікаваць пакуль не ўдалося); крэпасць ***Івангорад*** (*«thu zamek Moskiewsky Iwan Horod»*); замкі ***Нейшлос*** (*«thu Nowy zamek niemiecky»*, эст. – Vasknarva), ***Нарва*** (*«thu miedzi rzekami zamek niemiecky Iwan Horod, ktore(g)o Moskwa wziela»*), ***Везенбэрг*** (*«tho zamek Miezymberk»*, эст. – Rakvere) паміж дзвюма згаданымі рэкамі; замак **Дэрпт** (*«thu zamek Derpth»*, эст. – Tartu) і ***кляштар Фалькенаў*** (*«thu kliasstor iflianski Falchinof, oth Derptu dwie mili»*, каля эст. паселішча Kärkna); замкі дэрпцкіх біскупаў ***Кіррумпэ*** (*«thu zamek Kirimpi biskupy»*) і ***Нэйгаўзен*** (*«thu Nowy zamek drugy byskupy»*, эст. – Vastseliina), размешчаныя ў паўднёва-ўсходняй Эстоніі; замкі ***Адзель*** (*«thu Adziel zamek Moskwa spalila»*, латыш. – Gaujiena) і ***Марыенбург*** (*«A to zamek Marynburk»*, *«tho okolo zamku iezioro»*, *«tho mosth do zamku prez iezioro»*, *«tho yesth granica Maryenburku»*, латыш. – Alūksne), што знаходзяцца ў паўночна-ўсходняй Латвіі.

У параўнанні з усімі іншымі аб'ектамі найбольш падрабязна і з яўным парушэннем маштабу, калі ў выпадку схематычнага накіду ўвогуле можна карыстацца гэтым паняццем, на карце паказаны менавіта замак Марыенбург. Тут пазначана возера, на выспе якога ён размешчаны, мост, што вядзе праз возера да выспы з умацаваннем (згаданыя дэталі адпавядаюць рэальнасці), і «марыенбургская граніца». Можна меркаваць, што менавіта Марыенбург і падзеі вакол яго знаходзіліся ў цэнтры ўвагі аўтара малюнка.

Група ўмацаваных пунктаў, паказаных на карце ўздоўж лініі Дзвіны, далёка не ў поўнай меры адпавядае сетцы найважнейшых інфлянцкіх замкаў рэгіёна. Тут адсутнічаюць такія важныя аб'екты як Какенгаўзен (латыш. – Koknese), Кройцбург (латыш. – Krustpils) і шэраг іншых. У большай ступені яна нагадвае пералік замкаў (Больск, Рэжыца, Люцын, Дынабург, Зельбург, Марыенгаўзен, Ленегардэн), якія Інфлянцкі ордэн і рыжскі арцыбіскуп паводле ўмоў Віленскай дамовы ад 31 жніўня 1559 г. перадалі пад кантроль ВКЛ [3, с. 38] і якія ў канцы 1559 – пачатку 1560 г. былі заняты найма75 кантынгентам ВКЛ пад камандаваннем старосты прапойскага і чачэрскага Юрыя Мікалаевіча Зяновіча, а таксама Яна Геранімавіча Хадкевіча [3, с. 159–160].

Аналіз зместу карты паказвае, што прадстаўленая на ёй сітуацыя магла скласціся і існаваць толькі на кароткім храналагічным прамежку. У залежнасці ад трактоўкі сучасным даследчыкам такіх аб'ектаў, як паўднёвае заканчэнне лініі размежавання падкантрольных Маскве і Інфлянтам тэрыторый і лінія «марыенбургскай граніцы», стварэнне помніка можна датаваць часам ці незадоўга да захопу ў лютым 1560 г. войскамі Маскоўскай дзяржавы замка Марыенбург [3, с. 160], ці непасрэдна пасля гэтай падзеі (канец 1559 – першая палова 1560 г.).

На адваротным баку дакумента [4, арк. 238 адв.] змешчаны дзве адзнакі архіўнага ўліку XVIII ст.: 1) *«Нумар 5, звязка 66 спраў смаргонскіх»*, закрэслена; 2) *«Нумар 5, звязка 21 [спраў] смаргонскіх»*. Яны выкананы ў межах адной мадэлі класіфікацыі і адпавядаюць працам па ўпарадкаванні і апісанні дакументаў архіваў роду князёў Радзівілаў, ардынатаў нясвіжскіх, што праводзіліся ў XVIII – пачатку XIX ст. Гэтыя адзнакі з высокай ступенню верагоднасці ўказваюць на тое, што дакумент паходзіць з архіва роду Зяновічаў (Дэшпатаў-Зяновічаў), якія ў XVI – пачатку XVII ст. валодалі Смаргонню. Час стварэння карты адпавядае храналагічнаму прамежку жыцця і дзейнасці гаспадара Смаргоні, удзельніка Інфлянцкай вайны Юрыя Мікалаевіча Зяновіча (1510–1583). Варта адзначыць, што да Радзівілаў Смаргонь і смаргонскі архіў перайшлі толькі ў 1628 г. у выніку шлюбу князя Альбрэхта Уладзіслава Радзівіла (1589–1636) з Ганнай Зоф'яй Зяновіч (?–1664).

Такім чынам, можна меркаваць, што прадстаўленая карта была створана ў канцы 1559 – пачатку 1560 г. у асяроддзі аднаго з камандуючых найманым кантынгентам ВКЛ у Інфлянтах старосты прапойскага і чачэрскага (дакумент невыпадкова апынуўся сярод папер Прапойскага і Чачэрскага староствау!) Юрыя Мікалаевіча Зяновіча. Гэты малюнак можа лічыцца, што на першы погляд здаецца неверагодным, самым старым захаваным помнікам вайсковай картаграфіі ВКЛ (раней на гэтую ролю прэтэндаваў план аблогі замка Улы войскам ВКЛ, створаны Мацеем Стрыйкоўскім у 1568 г. [1, с. 161–166, 285]).

Другую са знаходак, неабходна аднесці да катэгорыі межавых ці ўладальніцкіх карт. Яна таксама ўяўляе значную цікавасць з навуковага пункту гледжання і, дзякуючы матэрыялам Метрыкі ВКЛ, можа быць упісана ў гістарычны кантэкст. Гэта – **план межаў вёскі Следзюкі** (цяпер аграгарадок у Быхаўскім раёне Магілёўскай вобласці) **Асавецкага войтаўства Магілёўскай эканоміі, складзены 22 кастрычніка 1605 г.**, які захаваўся ў копіі сярэдзіны XVIII ст. [5, арк. 292 адв., 300].

План займае ўсю паверхню складзенага *in folio* і падшытага ў кнігу аркуша без слядоў абрэзкі памерам каля 43×35 см. Выява складаецца з двух прамавугольнікаў, меншы з якіх упісаны ў большы. Унутраная прастора меншага прамавугольніка адпавядае галоўнаму аб'екту плана – вёсцы Следзюкі. Тут жа адзначана, што арыгінал дакумента быў складзены 22 кастрычніка 1605 г. для «княгіні Саламярэцкай», а яго копія (з якой мы і маем справу) унесена ў кнігі Магілёўскага магістрата па заяве жыхара Следзюкоў Кандрата Сідаровіча 18 кастрычніка 1752 г. [5, арк. 292 адв., 300].

На знешнім контуры большага прамавугольніка адзначаны шэраг дзяржаўных і прыватных населеных пунктаў, землі якіх межавалі з абшарам вёскі Следзюкі. Гэта: Быхаў (цяпер горад, раённы цэнтр Магілёўскай вобласці), Седзіч (цяпер вёска ў Быхаўскім раёне), Баркулабаў (цяпер аграгарадок Баркалабава ў Быхаўскім раёне), Сідаравічы (цяпер аграгарадок у Магілёўскім раёне), Перакладавічы (цяпер вёска ў Быхаўскім раёне), Кускевічы (цяпер вёска Кузькавічы ў Быхаўскім раёне). Іх размяшчэнне паказвае, што план мае арыентацыю «на захад». Прастора паміж унутраным контурам большага і знешнім контурам меншага прамавугольнікаў запоўнена апісаннем межаў паміж вёскай Следзюкі і згаданымі вышэй паселішчамі, лінія якіх абапіраецца на такія тапаграфічныя аб'екты, як рэкі, ручаі, азёры і балоты, пагоркі і нізіны, вялікія дрэвы, а таксама штучныя насыпы – «капцы» [5, арк. 292 адв., 300].



***Мал. 2. План межаў вёскі Следзюкі (1605 г.).***

Вядома, што ў пачатку XVII ст. паміж уладальніцай маёнтка Баркулабаў княгіняй Евай Баркулабаўнай Саламярэцкай (народжанай Корсак) і дзяржаўнымі сялянамі шэрагу вёсак Магілёўскай эканоміі, у тым ліку вёскі Следзюкі, мелі месца вострыя межавыя спрэчкі. Дайшло да таго, што справа была разгледжана выязным судом каралеўскіх камісараў, які правёў новыя межы і паставіў кропку ў канфлікце сваім дэкрэтам ад 1 лістапада 1604 г. (зацверджаны каралём і вялікім князем Жыгімонтам III Вазам 10 сакавіка 1605 г.) [3, с. 106; 6, арк. 216 адв.–220 адв.]. І на плане, і ў дэкрэце камісарскага суда мяжа паміж паселішчамі Следзюкі і Баркулабаў праведзена праз тыя ж самыя тапаграфічныя аб'екты – Малую Струху, Чыстую Лужу і Доўгую Лужу [5, арк. 292 адв., 300; 4, арк. 218 адв.–219], што служыць дадатковым аргументам на карысць аўтэнтычнасці помніка. Такім чынам,

стварэнне плана межаў вёскі Следзюкі 1605 г. можна ўпэўнена звязваць з правядзеннем у 1604 г. новых межаў паміж маёнткам Баркулабаў і Магілёўскай эканоміяй.

Па сваёй форме план межаў вёскі Следзюкі мала чым нагадвае сучасную карту. Аднак ён мае прамыя аналогіі ў межавой картаграфіі ВКЛ пачатку XVII ст. [1, с. 139, 280] і, па ўсёй верагоднасці, можа лічыцца дастаткова тыповым для сваіх рэгіёна і эпохі. Варта таксама дадаць, што план межаў вёскі Следзюкі з'яўляецца вельмі блізкім «земляком» і сучаснікам знакамітага твора старажытнай беларускай літаратуры – Баркулабаўскага летапісу, што ў пэўнай ступені павышае інтарэс да яго.

Знаходкі ўказаных карт у фондах НГА Беларусі яскрава сведчаць пра тое, што мэтанакіраванае выяўленне візуальных, у тым ліку картаграфічных, крыніц у дакументальных матэрыялах перыяду ранняга Новага часу з'яўляецца да цяперашняга часу актуальным і, несумненна, можа істотна ўзбагаціць айчынную гістарычную навуку.

1. Александровіч, С. Картаграфія Вялікага Княства Літоўскага ад XV да сярэдзіны XVIII стагоддзя / С. Александровіч. – Мінск : Тэхналогія, 2021. – 304 с.
2. Сліж, Н. Сямейныя адносіны і шлюбныя стратэгіі Саламярэцкіх у 16 – першай палове 17 ст. / Н. Сліж // Гістарычны альманах. – 2005. – Т. 11. – С. 86–121.
3. Янушкевіч, А. М. Вялікае Княства Літоўскае і Інфлянцкая вайна 1558–1570 гг. : манаграфія / А. М. Янушкевіч. – Мінск : Медисонт, 2007. – 356 с.
4. НГА Беларусі. – Ф. 694 («Радзівілы, князі»). Воп. 4. Спр. 1556. 246 арк.
5. НГА Беларусі. – Ф. 1817 («Магілёўскі магістрат»). Воп. 1. Спр. 92. 393 арк.
6. НГА Беларусі. – Ф. КМФ-18 («Метрыка ВКЛ»). Воп. 1. Спр. 88. 299 арк.

**Башнин Н.В., Резникова Т.В.**

## КАРТОГРАФИЧЕСКИЕ МАТЕРИАЛЫ И ПЛАНЫ XVII–XVIII ВВ. В МОНАСТЫРСКИХ ФОНДАХ: АРХЕОГРАФИЧЕСКИЕ ПЕРСПЕКТИВЫ[1]

Историки в XIX – первых десятилетиях XXI в. использовали карты для изучения различных вопросов (К.А. Неволин, М.К. Любавский, С.Б. Веселовский, М.В. Витов, А.Н. Насонов, А.И. Копанев, В.Л. Янин, Н.А. Макаров). При их составлении ученые привлекали не только писцовые и переписные книги, акты, но и картографические материалы XVI–XVIII вв.

Другим направлением стало изучение средневековых карт. Так, Б.А. Рыбаков подробно рассматривает сведения карт, изучает их возможные первоисточники. Однако сами карты публикуются исключительно как иллюстративный материал. Автор не приводит данных о размерах карт, о бумаге, на которой они составлены. Ученый, очевидно, не ставил задачу публикации данных материалов как исторического источника [16]. В. Кивельсон изучила картографические чертежи XVII в. как источник по социальной и культурной истории, но они также выполнили только иллюстративную функцию в книге [6]. Автор при прочтении карт (РГАДА. Ф. 1209) пользуется точкам ориентированности (в отдельных случаях их несколько на одном чертеже). В качестве иллюстраций чертежи опубликованы в работах Н.В. Башнина и В.О. Яковлева [1, ил. 5, 10; 21, с. 144–145, 152–153, 160].

В последние десятилетия для составления карт ученые используют редакторы векторной графики (Adobe Illustrator или Corel Draw) [4; 5; 16; 17], ГИС-технологии [2; 18; 19] и привлекают материалы Генерального межевания [3; 20]. Использование современных технологий может оказать значительное влияние на исследование карт и чертежей, поскольку позволяет провести визуализацию путем совмещения исторической и современной карт.

В.С. Кусов внес значительный вклад в исследование и публикацию русских картографических материалов XVI–XVIII вв. [7; 9]. Каталог (здесь и далее издание 2007 г.), составленный ученым, по сути является незавершенным научно-критическим изданием чертежей Русского государства. В.С. Кусов разработал подробную классификацию и систему описания чертежей. Подход ученого (указание даты, заголовка, размеров бумаги, филиграней, набор текста, указание географической и владельческой привязки и др. [8, с. 68–71]) позволяет раскрыть информационный потенциал картографических материалов даже при отсутствии самого изображения, что дает возможность пользоваться Каталогом отчасти как публикацией этих источников. Ученый ввел понятие «русский географический чертеж» [8, с. 65] и систематизировал источники этого типа XVI–XVII вв. по территориальному принципу и масштабу. Классификация по географическим признакам общепринята, а разработка классификации по масштабу является прорывом, поскольку на большей части чертежей он отсутствовал. Наличие подробного научно-справочного аппарата ставит Каталог в один ряд с современными базами данных.

[1] Исследование выполнено при поддержке РНФ, проект № 20–78–10060.